УДК 947.6(=411.6) (1914/1916)

# ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ЖАНЧЫН У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***Міхаіл Цуба ; Ганна Цуба***
*Пінск, Беларусь, Штайнпільц Бел, Мінск, Беларусь*
cubanm05@rambler.ru

Дадзены артыкул з’яўляецца адным з першых грунтоўных даследванняў малавядомых старонак дзейнасці беларускіх жанчын падчас Першай сусветнай вайны. На падставе аналізу архіўных матэрыялаў і прац розных аўтараў асвятляецца разнабаковая дзейнасць беларускіх жанчын у складаных умовах ваеннага часу.

***Ключавыя словы: Першая сусветная вайна, беларускія жанчыны, міласэрныя сёстры, медыцынская дапамога і медыцынская дзейнасць, ахвяраванні, дабрачыннасць, беларускае таварыства***

# THE ACTIVITIES OF BELARUSIAN WOMEN DURING WORLD WAR I

***Mikhail Tsuba ; Hanna Tsuba***
*Pinsk, Belarus, Steinpilz Bel, Minsk, Belarus*

Different aspects of the activities of Belarusian women during World War I are investigated on the basis of the analysis of archival materials and works of different authors. Special attention is paid to the various women activities in difficult wartime conditions.

***Keywords: World War I, Belarusian women, Sisters of Mercy, medical care and medical activities, donations, charity, Belarusian Society for Aid to War Victims***

1 жніўня 1914 года пачалася Першая сусветная вайна. Пачатак гэтай вайны быў сустрэты ў Расійскай імперыі з уздымам і энтузіязмам. Не сталі выключэннем і беларускія землі. Каля размеркавальна-прызыўных пунктаў стаялі шэрагі добраахвотнікаў. Патрыятычны ўздым не прамігнуў і жанчын. Нягледзячы на тое, што за апошняе дзесяцігоддзе ўвага да падзей Першай сусветнай вайны істотна ўзрасла: розныя аспекты абазначанага кола праблем знаходзілі адлюстраванне ў навуковай літаратуры. Усё ж патрэбна адзначыць на сённяшні дзень няма ніводнага комплекснага даследвання, якое б непасрэдна датычылася ўдзелу і дзейнасці беларускіх жанчын у вызначаны перыяд.

У першыя дні вайны ва ўсіх беларускіх губернях, якія з’яўляліся прыфрантавой паласой расійскага Паўночна-Заходняга фронту, было ўведзена ваеннае становішча. У сувязі з чым амаль у кожным на беларускіх землях губернскім і павятовым горадзе многія мясцовыя бальніцы пераводзіліся ў разрад ваенных шпіталяў, лазарэтаў і санаторыяў. Акрамя таго на гэтыя патрэбы выдзяляліся дачы, сядзібы некаторых беларускіх людзей па іх дамоўленасці з мясцовай ваеннай адміністрацыяй. Таксама ствараліся

розныя супрацьэпідэмічныя, перавязачныя пункты і рухомыя лячэбна-эвакуцыйныя і санітарна-транспартныя ўстановы.

У выніку адчуваўся недахоп медперсаналу. Вайна правяла да таго, што многія беларускі вырашылі прыняць пасільны ўдзел у дапамозе фронту. Дзяўчаты і жанчыны пачалі ў масавым парадку запісвацца на курсы міласэрных сёстраў. Гэта былі прадстаўніцы розных сацыяльных пластоў: ад простых сялянак і мяшчанак да дзяўчын з багатых саслоўяў – магнатаў, дваран, шляхты, дочак чыноўнікаў і афіцэраў. Нямала сярод іх было свядомых у нацыянальных адносінах беларусак, якія імкнуліся ўмацаваць пазіцыі беларускага адраджэнскага руху ў грамадстве.

Забараніўшы дзейнасць грамадска-палітычных згуртаванняў у армейскім тыле, царскі ўрад заахвочваў стварэнне нацыянальных камітэтаў па аказанню дапамогі ахвярам вайны. Так з красавіка 1915 года ў Вільні распачала сваю працу беларуская дабрачынная арганізацыя "Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны". Асноўнымі накірункамі работы таварыства з'яўляліся стварэнне і арганізацыя пунктаў харчавання, адкрыцця сталовых, інтэрнатаў, школ, дзіцячых прытулкаў, а таксама аказанне медыцынскай дапамогі ўсім тым, хто пацярпеў ад вайны: бежанцы і іх дзеці, сем'і, з якіх былі заклікалы мужчыны ў салдаты, сем'і, страціўшыя кармільцаў, асірацелыя дзеці і г.д. Сродкі на выкананне дабрачынных спраў складаліся з членскіх узносаў, ахвяраванняў, а таксама з культурна-дабрачынных мерапрыемстваў. Відную ролю ў гэтым таварыстве адыгрывалі сёстры Юліяна і Ляля Мэнке (прычым Юліяна з'яўлялася скарбнікам таварыства), Аляксандра Рачкоўская, Марыя Кастравіцкая і асабліва Алаіза Пашкевіч (Цётка) [1, с. 45].

Разам з тым Алаіза Пашкевіч працавала яшчэ ў віленскім шпіталі "Мішмерас-Хойлем" міласэрднай сястрою і, паводле ўспамінаў Максіма Гарэцкага, па-свойму выконвала ўскладзены на яе ваенным ліхалеццем абавязак. Акрамя сваёй непасрэднай медыцынскай працы, яна ніколі не забывала падкладваць выдадзеныя нумары газеты "Наша ніва" пад падушкі параненым беларусам [2, с. 88].

Пасля акупацыі Вільні кайзераўскімі войскамі "Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны" працягвала сваю работу. Менавіта па хадатайніцтву гэтага таварыства, дзякуючы намаганням Алаізы Пашкевіч, Юліяны Мэнке, Лідзіі Чарняўскай і іншых была адчынена беларуская настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы Ваўкавыскага павета, што на Гродзеншчыне. Дадзеная семінарыя, якая распачала працу 17 кастрычніка 1916 года, павінна была рыхтаваць настаўнікаў для беларускіх школ, у якіх маглі вучыцца ўсе жадаючыя дзеці. Акрамя мужчын, вядомых беларускіх дзеячаў, якія вялі заняткі ў семінарыі, вялікую долю складалі жанчыны. Цётка вяла педагогіку, Ю. Мэнке – нямецкую мову, М. Клімант – спевы, С. Іваноўская – гімнастыку, Я. Булгак – гігіену [2, с. 121].

Сярод іншых дзеячак беларускага нацыянальнага руху ў першы год вайны звяртае на сябе ўвагу Уладзіслава Станкевіч (Луцэвіч), якая ў 1916 г. выйдзе замуж за Я. Купала. Яна друкавала свае вершы ў "Нашай ніве", рэкламавала беларускую літаратуру і нават змагла заснаваць прытулак для дзяцей бежанцаў.

У 1914—1915 гг. у Вільні ажыццяўляў сваю дзейнасць Беларускі музычна-драматычны гурток на чале з Алесем Бурбісам. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтага гуртка з'яўляліся Алаіза Пашкевіч, Людвіка Сівіцкая, Паўліна Мядзёлка, Канстанцыя Буйло і інш. Гурткоўцы наладжвалі вечары нацыянальнай культуры, ставілі спектаклі, вялі асветніцкую дзейнасць, прапагандавалі народныя песні, танцы, творы беларускай драматургіі. У неспрыяльных умовах ваеннага часу беларускія тэатральныя дзеячкі, улічваючы ў якім становішчы апынулася беларускае насельніцтва, у сваіх выступах часта высмейвалі і крытыкавалі самадзяржаўе, але ў той жа час падтрымлівалі мерапрыемствы ўрада накіраваныя на дабрачынную дапамогу пацярпелым ад вайны. Выступленні гуртка карысталіся вялікім поспехам не толькі ў гледачоў на беларускіх землях, але і па-за межамі. Напрыклад, для беларускіх бежанцаў тэатральныя выступленні наладжваліся ў Петраградзе, Маскве, Днепрапятроўску, Тамбове. Усе дадзеныя мерапрыемствы насілі дабрачынны характар, на сабраныя сродкі аказвалася дапамога беларускім бежанцам, параненым, салдацкім сем'ям.

У 1916 – пачатку 1917 гг. значныя змены ў беларускай справе адбыліся і ва ўсходняй частцы Беларусі, якая ўваходзіла ў сферу дзейнасці расійскіх войск. У гэты час у вялікіх і малых гарадах, а таксама мястэчках на неакупіраванных немцамі беларускіх землях пачынаюць дзейнічаць самыя розныя нацыянальныя па форме арганізацыі, як дабрачынныя, так і культурна-асветніцкія. Як правіла, па суботах у форме "беларускіх хатак" адбываліся доўгія і змястоўныя вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся беларускія нацыянальныя справы. Часта арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, а набытыя сродкі выдаткоўваліся на дабрачыннасць [1, с.47].

У Мінску адным з такіх пунктаў, які аб'ядноўваў беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, публіцыстаў, вучоных, мастакоў, артыстаў і іншых культурных дзеячаў, з'яўлялася "беларуская хатка", створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела "Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны". У яе рабоце таксама, як і ў працы таварыства прымала актыўны ўдзел прадстаўніца магнацкага беларускага роду Марыя Магдалена Радзівіл. Яе можна лічыць асноўнай на беларускіх землях мецэнанткай на патрэбы дабрачыннасці звязаныя з вайной, а таксама на розныя беларускія справы. Дарэчы, Марыю Магдалену часта называюць самай беларускай з усіх Радзівілаў. Так як яна ўсюды размаўляла толькі на беларускай мове і

прывівала гэта іншым. На яе грашовыя і рэчавыя ахвяраванні былі адчынены беларускія школы, прытулкі для дзяцей, бальніцы, храмы; выдаткоўваліся грошы на падтрымку беларускага тэатра, выданне кніг і г.д. Напрыклад, на пачатку вайны дзякуючы яе мецэнацтву была выдадзена кніга вершаў Максіма Багдановіча "Вянок", а таксама творы Максіма Гарэцкага, Якуба Коласа і іншых.

Уплывовымі дзеячкамі "Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны" былі Ванда Лявіцкая і, эвакуіраванная з Вільні ў Мінск, Зоська Верас, якая з'яўлялася сакратарам арганізацыі. Людвіка Сівіцкая (псеўданім Зоська Верас) мела да гэтага істотны вопыт работы ў віленскім Беларускім камітэце, які меў на мэце пашырыць веды пра Беларусь, яе гісторыю, мову, культуру, развіваць нацыянальную свядомасць. Зоська Верас займалася літаратурнай творчасцю, друкавалася ў газеце "Наша ніва". Яна ўдзельнічала разам з Цёткай у 1915 годзе ў адкрыцці беларускай школы, а затым беларускіх настаўніцкіх курсаў, дзе выкладала нямецкую мову і педагогіку. Менавіта пад іх уплывам дадзенае таварыства арганізоўвала і праводзіла асветніцка-культурныя і дабрачынныя мерапрыемствы, мерапрыемствы ў абарону беларускай культуры, збіраліся сродкі для аказання дапамогі параненым, бежанцам, салдацкім сем'ям [1, с. 48].

Актыўны ўдзел у працы таварыства прымала яшчэ зусім юная 16-ці гадовая Апалонія Раткевіч (Савёнак па-мужу). Будучая пісьменніца аб наведванні "беларускай хаткі" падчас вайны ў сваім артыкуле "Калісьці ў Менску" ўспамінала: "Ніхто не чытаў нам лекцыяў, не пераконваў, не агітаваў. Гэтыя выдатныя людзі выбралі найвастрэйшую зброю – мастацкае слова. Яны прамаўлялі да нас вуснамі нашых паэтаў-адраджэнцаў … калі Лявіцкая дэклямавала цёплыя Цётчыны ды Буйлянчыны творы – тут была й любасць да пакрыўджанае Бацькаўшчыны, і слаўная мінуўшчына яе, і пашана да свае мовы. Гэта было для нас і навукай, і клічам, і загадам, і праграмай дзейнасці. Мы бачылі ідэю, тую высокую, велічную ідэю змагання за волю свае Бацькаўшчыны й свайго народу …" [3, с. 12].

Пачынаючы з другой паловы 1915 года галоўнымі цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху становяцца Петраград, Масква, Калуга, Кіеў, Адэса і іншыя гарады. Створаныя тут бежанскія арганізацыі сталі апорнымі пунктамі збору беларускіх дзеячаў для наладжвання дабрачыннай і нацыянальнай працы. У гэтым плане Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны з'яўлялася ўзорам для іншых. Гэтае таварыства аказвала дапамогу грашыма, адзеннем і рэчамі, адчыняла інтэрнаты для беларускіх студэнтаў і вучняў, дзіцячы прытулак, кравецкую майстэрню, выдавала рэкламныя лістоўкі з заклікам ахвяраваць грошы для беларускіх бежанцаў, якіх дарэчы налічвалася ў Петраградзе ў канцы 1916 года 100 704 чалавекі [4, арк. 157]. Заснавальнікам дадзенага таварыства быў вядомы Б.І. Эпімах-Шыпіла, а пад яго кіраўніцтвам, акрамя бяспрэчна мужчын, працавалі вельмі ініцыятыўныя беларускія дзеячкі Я.В. Кавецкая, М.А. Дзевялтоўская-Гінтаўт і сакратаром з'яўлялася П.В. Мядзёлка. Намаганнямі ў першую чаргу гэтых жанчын у лістападзе 1916 года для дзяцей беларускіх бежанцаў была адчынена першая легальная беларуская школа на неакупіраванннай немцамі тэрыторыі Расійскай імперыі. Навучанне, падручнікі і абеды ў школе былі бясплатныя. Уражваюць аб'ём работы і адлегласці, якія падчас вайны пераадольвала Паўліна Мядзёлка. На пачатку 1917 года яна ўжо на тэрыторыі Украіны, дзе ўладкоўваецца на работу ў дабрачынную арганізацыю "Саюз гарадоў". У гэтай арганізацыі П.В. Мядзёлка працавала ў аддзеле дапамогі ахвярам вайны па стварэнню дзіцячых прытулкаў у Кіеве. Затым у кастрычніку 1917 года з Кіева прыязджае ў Мінск, дзе на сцэне гарадскога тэатра (сёння тэатр імя Я. Купалы) чарговы раз іграе галоўную ролю ў прысвечанай ёй Я.Купалам п'есе "Паўлінка" выступаючы для з'езда салдацкіх дэпутатаў прадстаўнікоў заходняга фронту. А праз некалькі дзён згодна дамоўленасці з Марыяй Магдаленай Радзівіл стварае беларускую школу ў вёсцы Жорнаўка (Ігуменскага павета), у якой нейкі час працуе настаўніцай.

Даволі насычаным на падзеі ў ваенны перыяд было і жыццё беларускай паэтэсы Канстанцыі Буйло. У 1914 годзе ў Вільні яна заканчвае настаўніцкія курсы, затым на пачатку вайны друкуе сваю знакамітую кніжку вершаў "Курганная кветка". Вершамі К. Буйло захапляўся Я. Купала, ён дарэчы і благаславіў выданне гэтай кніжкі. Напрыканцы 1914 – пачатку 1915 года Канстанцыя Буйло працавала настаўніцай у адной з вёсак Лідскага павета, дзе вучыла, як мясцовых дзяцей, так і дзяцей бежанцаў. У другой палове 1915 года яна з'язджае ў Полацк, дзе працуе загадчыцай бібліятэкі. А затым у 1916 – 1917 гг. у Земскім саюзе гэтага горада. Абавязкі, якія К. Буйло выконвала на працы былі звязаныя з бежанскім рухам, клопатам аб лёсе сем'яў, з якіх хтосьці быў мабілізаваны на фронт, а таксама ў аказанні дапамогі параненым салдатам. Калі яе вершы не сыходзілі з выдання ў 1914 – першай палове 1915 з старонак газеты "Наша ніва", то з такім жа поспехам яны друкаваліся на працягу 1916 года ў газеце "Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны" ў Петраградзе "Дзянніца", рэдактарам-выдаўцом якой з'яўляўся Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч) [5, с. 25].

Дабрачынны пачын Марыі Магдалены Радзівіл у гады вайны падтрыманы і іншымі прадстаўніцамі магнацкага роду. Так як у нясвіжскім замку Радзівілаў знаходзіўся шпіталь для параненых і хворых воінаў, то самім лёсам было наканавана Даратэі Радзівіл і Розе Святаполк-Чацвярцінскай стаць сёстрамі міласэрнасці Мінскай абшчыны Чырвонага Крыжа і аказваць пасільную дапамогу параненым. Спраўна выконвала абавязкі міласэрнай сястры таксама гомельская графіня Аляксандра Шувалава, якая нават пад

моцным артылерыйскім агнём змагла ажыццявіць перавязку параненых. Вялікую дабрачынную дзейнасць праводзіла ў час ваеннага ліхалецця апошняя ўладальніца гомелькага палацу Тышкевічаў княгіня Ірына Паскевіч. Шмат грашовых і рэчавых ахвяраванняў яна бескарысна аддала дзеля таго, каб дапамагчы пацярпелым ад вайны выйсці са становішча цемры і галечы. Нават свой адзіны, што быў на хаду легкавы аўтамабіль яна перадала ў ведама Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа, які быў накіраваны на фронт для перавозкі параненых у шпіталі [6, арк 27].

І ўсё ж ва ўсіх вышэй згаданых жанчын пераважаў дабрачынны, культурна-нацыянальны накірунак іх дзейнасці. Але былі беларускія жанчыны, для якіх у ваенных абставінах галоўнымі з'яўляліся службовыя абавязкі. Вайна прымала зацяжны характар. Жанчын сталі заклікаць на ваенную службу. Але служылі яны ў асноўным у розных тылавых фарміраваннях у якасці медыцынскага персаналу. Тым не менш міласэрныя сёстры рызыкуючы сваім жыццём часта выконвалі свае абавязкі не толькі ў шпіталях і лазарэтах прыфрантавых гарадоў, але і на перадавой.

Некаторые медыкі-жанчыны беларускага паходжання мелі грунтоўную падрыхтоўку ў галіне ваеннай медыцыны і па адукацыі з'яўляліся ваеннымі ўрачамі. Адна з іх Алёна Міхайлаўна Дзелару (дзявочае прозвішча Расноўская) у 1916 – 1917 гадах працавала асістэнтам кафедры эксперыментальнай гігіены Кіеўскага медінстытута. Адначасова з'яўлялася ардзінатарам эвакуцыйнага шпіталя ў Кіеве. Напрыканцы вайны будучы ўрачом лячыла хворых тыфам у ваенных шпіталях. У пасляваенны час заведавала кафедрай у Віцебскім медінстытуце [7, с. 70].

Істотную вядомасць набыла медыцынская дзейнасць ураджэнкі Віцебшчыны Н.М. Ярмаловіч. Спачатку ў 1916 – 1917 гадах яна працавала міласэрнай сястрой у эвакуцыйным ваенным шпіталі Віцебска. Затым у 1918 – 1919 гадах у Петраградзе аказвала медыцынскую дапамогу беларускім бежанцам і адначасова вучылася ў тэатральным інстытуце. Пасля яго заканчэння працавала ў тэатры Усевалада Мейерхольда, была асабіста знаёма з Сяргеем Ясеніным і Аляксандрам Блокам. Тым не менш медыцынскі накірунак з цягам часу ўзяў верх. Маючы вышэйшую медадукацыю яна затым узначальвала санэпідэмстанцыі ў Віцебску і Магілёве [7, с. 71].

Вобраз жанчын-гераінь у гады Першай сусветнай вайны непасрэдна звязваўся з найпрыгажэйшым тыпам сястры міласэрнасці, якую называлі “белым анёлам”. Вобраз такога накірунку актыўна прапагандаваўся ў расійскіх сродках інфармацыі, а сама жанчына ў гэты перыяд лічылася памочнікам салдата. Камплект форменнага адзення сястры міласэрднасці быў розным: вясной-летам гэта лёгкія белыя сукенкі з такімі ж белымі хусткамі альбо накідкамі, восенню-зімой, як правіла, карычневага колеру сукенка з белым фартукам, на якім быў пазначаны чырвоны крыж, на галаве шырокая хустка, на левай руцэ белая павязка з чырвоным крыжам. Дадаткова выдаваліся яшчэ цёплае паліто альбо скураная куртка. Гэтае адзенне, якое тады лічылася вельмі модным і папулярным, сёстрам міласэрнасці дазвалялася адзяваць толькі падчас выканання сваіх непасрэдных абавязкаў: на тэатры ваенных дзеянняў, у тыле, у шпіталях, санітарных цягніках і г.д. Але забаранялася пасля дзяжурных змен з'яўляцца ў дадзенай форме на вуліцах гарадоў, наведваць кіно, знаходзіцца ў розных забаўляльных месцах ці іншых грамадскіх установах. Сястрой міласэрнасці магла стаць удава альбо дзяўчына ад 18 да 40 гадоў любога саслоўя, але хрысціянскага вераспавядання.

Сёстры міласэрнасці самаахвярна выконвалі ўскладзеныя на іх абавязкі працуючы на перавязачных пунктах, у перапоўненых шпіталях і лазарэтах, на чыгуначных станцыях і ў санітарных цягніках. У асобных выпадках яны знаходзіліся нават на баявых пазіцыях і ў акопных траншэях, дзе пад агнём варожай артылерыі, стралковай зброі, налётаў авіяцыі працягвалі аказваць дапамогу параненым. Самааддана ратавалі салдат і мірнае насельніцтва падчас прымянення ўдушлівых газаў. У цяжкіх умовах абслугоўвалі ўсім неабходным і лячылі хворых тыфам.

Аднак першыя ўзнагароды на беларускіх землях георгіеўскімі медалямі 4 ступені, міласэрныя сёстры Брэст-Літоўскага ваеннага шпіталя №9 атрымалі не за вышэй пералічаныя акалічнасці, а з-за неахайнасці і халатнасці расійскіх салдат прывёўшых да пажару і выбуху снарадаў на артылерыйскім складзе. Менавіта за выратаванне параненых салдат падчас выбуху артылерыйскага склада 5-га лістапада 1914 года ў Брэст-Літоўску і праяўленыя пры гэтым мужнасць і доблесць, сёстры міласэрнасці Анеля Жылінская, Еўдакія Уладзімірава, Марыя Лапшына, Лізавета Кузняцова і Надзея Філіпчанка ўдастоіліся гэтых узнагарод [8].

На пачатку 1915 года германскае камандаванне вырашыла асноўныя сілы сваіх войск перакінуць з захаду на ўсход. У красавіку 1915 года пачалося наступленне аўстра-венгерскіх войск у Галіцыі, а ў маі ў раёне Горліца – Тарноў іх падтрымалі германскія арміі. Амаль што на ўсім сваім працягу Усходні фронт быў узламаны. Расійская армія была вымушана пакідаць раней заваяваную Галіцыю і адступаць з Польшчы.

Менавіта ў раёне Горліца – Тарноў каля чыгуначнай станцыі Ясло здзейсніла свой подзвіг сястра міласэрнасці мінскай абшчыны Надзея Бортнік. 15 красавіка 1915 года Н.М. Бортнік падчас абстрэлу і скідвання бомбаў з варожых аэрапланаў, рызыкуючы ўласным жыццём, засталася на пазіцыях і аказвала дапамогу параненым, за што была адзначана георгіеўскім медалём 3 ступені. Праз дзень 16 красавіка 1915

года каля гэтай жа польскай чыгуначнай станцыі вызначыліся родныя сёстры з той жа мінскай абшчыны Ганна і Марына Мысліўчыкі, якія з небяспекай для жыцця пад абстрэлам ажыццяўлялі перавязку параненых. Пры чым Марына Мысліўчык будучы параненай сама, працягвала аказваць дапамогу цяжкапараненым салдатам. За праяўленую мужнасць абедзьве сястры былі ўзнагароджаны георгіеўскімі медалямі 4 ступені [8].

У ваенна-інжынерных адносінах аператыўны раён на подступах да Беларусі не ўяўляў сабой надзейнай сістэмы, на якую б расійскія войскі змаглі б абаперціся пры наступленні і спыніць праціўніка пры абароне. Лепшыя ў той час ваенна-інжынерныя сілы Расіі замест падрыхтоўкі агульнага абарончага рубяжа заняліся пераважна ўмацаваннем крэпасной сістэмы, не ўцяміўшы, што крэпасная стратэгія і тактыка ўжо зжылі сябе. У выніку далейшага працягу наступу германскіх і аўстра-венгерскіх войск летам 1915 года ваенныя дзеянні разгарнуліся непасрэдна на беларускіх землях.

Уражвае сваёй самаадданасцю справе і смеласцю ўчынак сястры міласэрнасці 484-га палявога эвакуацыйнага шпіталя Надзеі Дубінінай. 11 ліпеня 1915 года шпіталь, які знаходзіўся паблізу вёскі Пасекі, што на Ваўкавышчыне, быў абстраляны цяжкай артылерыяй праціўніка. Шацёр перапоўнены параненымі аказаўся разарваным снарадамі. Некаторыя параненыя атрымалі раненні паўторна. У гэтых абставінах Надзея Дубініна змагла цяжкапараненых адцягнуць у бяспечнае месца і аказаўшы ім своечасовую медыцынскую дапамогу, выратавала ад смерці. Прыкладна ў такіх жа ўмовах аказаўся медперсанал з гродзенскага эвакуацыйнага лазарэта Чырвонага Крыжа, у якім неслі службу міласэрныя сёстры Марыя Мухіна, Марыя Пыхачова, Лізавета Плакунова, Вера Самохіна, Арыядна Чарненка, Алёна Дваржыцкая, Наталля Міронава, Зоя Пісарава, Ганна Будзіна і Ганна Усакоўская. Усе вышэй пералічаныя дзяўчаты атрымалі баявыя ўзнагароды ў выглядзе георгіеўскіх медалёў 3 і 4 ступеняў за выратаванне параненых падчас баёў каля горада Ліды 3 верасня 1915 года [8].

Георгіеўскую медаль 4 ступені атрымала і настаўніца пастаўскай школы Аляксандра Герасімава за тое, што ў ноч з 17 на 18 верасня 1915 года пад варожым агнём, да прыбыцця медперсаналу перавязачнага пункта, ажыццяўляла дапамогу параненым. Такім жа медалём была ўзнагароджана міласэрная сястра мінскай абшчыны Лізавета Крэчатовіч за мужнасць, якую яна праявіла пры аказанні меддапамогі параненым салдатам падчас скідвання бомбаў з германскіх аэрапланаў на чыгуначны вакзал Маладзечна. На пачатку 1916 года ў ходзе баёў на Віцебшчыне, аказваючы дапамогу параненым, вызначыліся міласэрная сястра віцебскай абшчыны Ванда Хведаровіч, а таксама прадстаўніца Усерасійскага земскага саюза Софія Шчоўкан. Абедзве былі ўзнагароджаны георгіеўскімі медалямі 4 ступені. Медаль такой жа пробы атрымала і сялянка Паўліна Савук з вёскі Пасынкі, што на Вілейшчыне. Яна на працягу некалькіх дзён хавала ў сваёй хаце трох уцекачоў з германскага палону, а затым іх тайна перавяла праз германскія пазіцыі да размяшчэння расійскіх войск.

Быў на беларускіх землях і свой Антон Пальшын, дакладней Антаніна Пальшына. Вядомая расійская гераіня, георгіеўскі кавалер, якая ў 18-ці гадовым узросце з самага пачатку вайны ўдзельнічала ў ваенных дзеяннях пад выглядам мужчыны. Менавіта 17-ці гадовая Вольга Шыдлоўская, дачка магілёўскага віцэ-губернатара і дэпутата Дзяржаўнай Думы Сяргея Шыдлоўскага пасля дазволу служыць у войсках была залічана ў 4 гусарскі Марыупальскі полк пад імем Алега Сяргеевіча Шыдлоўскага. Яна прымала ўдзел ва ўсіх баях дадзенага палка. З 1915 да 1917 года з яфрэйтара даслужылася да старшага ўнтэр-афіцэра і была ўзнагароджана двума георгіеўскімі медалямі [8].

Часам не шкадуючы сябе, коштам асабістага жыцця беларускія жанчыны ратавалі салдат і афіцэраў расійскай арміі выносячы іх з пекла вайны і аказваючы першую медыцынскую дапамогу. Як прыклад, можна прывесці смерці і раненні міласэрных сёстраў эвакуацыйнага шпіталя 2-й расійскай арміі Заходняга фронту. 31 ліпеня 1916 года ў час налёту варожай авіяцыі на станцыю Сіняўка, што паблізу Клецка, медперсанал дадзенага шпіталя аказваў дапамогу параненым. Але бомбамі, якія разарваліся побач з шпіталем былі забітыя сёстры міласэрнасці А.В. Рауэр, І.В. Чагіна, А.В. Цюцюкова, атрымала цяжкае раненне А.А. Конюхава, а таксама лёгкія раненні і кантузіі мелі В.І. Іванова, А.В. Серабракова, Л.М. Порахава. Усе вышэй акрэсленыя жанчыны былі адзначаны георгіеўскімі медалямі 2, 3 і 4 ступеняў.

Аднак гінулі міласэрныя сёстры не толькі ад куль і бомбаў. Тыф, халера, іншыя хваробы касілі людзей не менш, чым зброя. Часта маладых дзяўчат, якія скончылі медыцынскія курсы накіроўвалі ў эпідэмічныя атрады, альбо размяркоўвалі ў ваенна-санітарныя цягнікі. Напрыклад ёсць звесткі, што на пачатку 1917 года 21 гадовая мяшчанка з Магілёва Надзея Аўдзеева вельмі спраўна выконвала свае абавязкі па лячэнню захварэўшых тыфам на Піншчыне і ў мястэчку Столін. Тое ж самае можна сказаць аб ураджэнцы Віцебска Любові Канстанцінавай, якая працуючы на ваенна-санітарным цягніку заразілася тыфам і памёрла падчас догляду хворых і параненых. 22 гадовую дзяўчыну з воінскімі ўшанаваннямі пахавалі на Брацкіх могілках у Маскве [8].

Задзейнічанне жанчын і прымяненне іхняй працы ў гады Першай сусветнай вайны адбывалася і ў іншых накірунках. Напрыклад, па абавязковай пастанове ў жніўні 1916 года начальніка мінскай ваеннай

акругі "…бежанцы, а таксама сяляне прыфрантавых паветаў і іншыя асобы абоега пола ад 15 да 50 гадоў павінны прыцягвацца да работ звязаных з патрэбамі арміі" [9, арк.109].

Як правіла грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку і жанчын, часта прымусова прыцягвалі працаваць на работы па ўмацаванню баявых пазіцый, на разгрузцы чыгуначных эшалонаў, пабудове і рамонту дарог, мастоў, чыгуначных вузкакалеек і г.д. У сувязі з бесперапынна паступаючымі ад ваенных улад патрабаваннямі аб накіраванні грамадзянскага беларускага насельніцтва на ваенныя работы і ў мэтах уліку рабочых сіл, на пачатку 1917 года мінскі губернатар загадаў павятовым іспраўнікам высвятліць колькасць усіх працаздольных жанчын і мужчын, якія прыцягнуты на прымусовыя работы. У выніку атрымалася, што ў канцы 1916 года ў Мінскай губерні на прымусовых ваенных работах былі заняты 219 300 жанчын і мужчын, у Віцебскай губерні – 121 200. Па сутнасці да гэтых работ прыцягвалася ўсё мясцовае насельніцтва, большасць з якога складалі жанчыны [10, с.78].

Акрамя таго жанчыны замянілі закліканых на фронт мужчын не толькі ў сельскай гаспадарцы, а таксама на рознага профілю прамысловых прадпрыемствах, на ваенных заводах, фабрыках, асвойвалі новыя для іх прафесіі і спецыяльнасці.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года кіраўнік Часовага ўрада Аляксандр Керанскі, у сувязі з фактычным развалам фронту і нежаданнем ваяваць мужчын, дазволіў стварыць першае ў сусветнай гісторыі баявое жаночае фарміраванне пад назвай "Жаночы батальён смерці" на чале з Марыяй Бачкаровай. Такі неардынарны падыход, па меркаванню А.Ф. Керанскага, павінен быў прывесці да адчування сораму мужчын-дызерціраў і галоўнае падняць баявы дух у салдат расійскай арміі. Улічваючы той факт, што дадзены батальён дыслацыраваўся на беларускіх землях, у раёне горада Маладзечна, а затым ажыццявіў свой вядомы наступ на Крэва, каля Смаргоні, то нельга выключыць магчымасці, што хтосьці з жанчын беларускага краю, ці з беларускімі каранямі, таксама ўваходзіў у яго склад.

Такім чынам, падчас Першай сусветнай вайны многія беларускія жанчыны па абодва бакі расійска-германскага фронту, а таксама ў больш глыбокім тыле праяўляючы незвычайнае самавалоданне і ахвярнасць выконвалі ўскладзеныя на іх культурна-нацыянальны, духоўна-дабрачынны і ваенна-патрыятычны абавязкі.

Як бачым, беларускія жанчыны разам з выкананнем дабрачынна-медыцынскай функцыі, таксама праводзілі вялікую працу па адраджэнню самасвядомасці беларусаў. Так, цяжкасці ваеннага часу не толькі не прывялі да паслаблення беларускай грамадскай справы, але загартоўвалі, вучылі прадстаўніц беларускага нацыянальнага руху па-новаму арганізоўваць і спалучаць у адзіным цэлым дабрачынную і культурна-нацыянальную працу.

Увогуле дзейнасць беларускіх жанчын у ваеннае ліхалецце была вельмі актыўнай, шырокай і шматпланавай. Многія з іх служачы ў розных дапаможных ваенна-тылавых фарміраваннях у якасці медыцынскага і тэхнічнага персаналу паказвалі прыклады сапраўднай мужнасці і гераізму.


1. Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі у кантэксце сусветных падзей (грамадскі і ваены бакі) 1914 - 1918 гг. / М.В. Цуба. - Пинск : УО "ПолесГУ", 2010. - 304 с.
2. Цуба, М.В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 - люты 1917гг.). Матэрыялы да курса "Гісторыя Беларусі' / М.В. Цуба. - Брэст, выдавецтва С. Лаўрова - 2003., 196 с.
3. Мяснікоў, А. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка / А. Мяснікоў, прадмова Б.Сачанкі. – Мінск: Беларусь, 1993. – 110 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф.62. – Воп.1. – Спр.197.
5. Цуба, М.В. Дзейнасць беларускіх бежанскіх арганізацый на тэрыторыі Расіі падчас Першай сусветнай вайны (жнівень 1915 - люты 1917 гг.) / М.В. Цуба // Вестник Полесского государственного ун-та. Серия общественных и гуманитарных наук - 2009. - № 2. - С. 23 - 27.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф.299. – Воп. 3. – Спр.1576 "Аддзел палявога складу Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа Заходняга фронту (г. Мінск, 1915-1916 гг.)".
7. Кульпанович,О.А. Врачи Беларуси – участники двух мировых войн / О.А.Кульпанович // Здравоохранение. 2015, - №5. – с.68-73.
8. Самович, А. Под Красным Крестом милосердия / А. Самович // РУБОН - сайт военной археологии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rubon-belarus.com/military-history/1ww/podkrasnymkrestom.html. – Дата доступа: 09.01.2022.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф.705. – Воп.1. – Спр.27.
10. Цуба, М.В. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914 - люты 1917 гг.). Матэрыялы да курса "Гісторыя Беларусі'/ М.В.Цуба. - Мінск, "Арты-Фэкс", - 2006. - 231 с.